# Справаздача аб дзейнасці Каардынацыйнай рады другога складу за перыяд з 9 лютага 2023 года па 9 лютага 2024 года

9 жніўня 2022 года на канферэнцыі «Новая Беларусь» у Вільні КР прыняла рашэнне аб рэарганізацыі сваёй дзейнасці ў рамках фарміравання Новай канфігурацыі дэмакратычных сіл. Падчас рэфармавання структур дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці было прапанавана вылучыць сваіх дэлегатаў, а падчас другой хвалі абіраліся самавылучэнцы.

У пачатку лютага 2023 года рэфармаванне завяршылася. Усяго ў новы склад КР увайшло 110 чалавек: 22 удзельнікі з першага складу, 73 новыя дэлегаты грамадскіх арганізацый і 15 самавылучэнцаў. Сярод іх: Андрэй Ягораў, Алена Жываглод («Сумленныя людзі»), Паліна Бродзік (Free Belarus Center), Стася Гліннік («Беларускі Моладзевы Хаб»), Аляксандр Кныровіч, Таццяна Хоміч («Разам»), Святлана Мацкевіч («Асацыяцыя родных і былых палітвязняў»), Аляксандр Дабравольскі, Ян Рудзік, Віталь Рымашэўскі (партыя БХД), Алесь Міхалевіч і Юрась Губарэвіч (рух «За Свабоду»), Ганна Краўчанка («Рух большасці»), Арцём Брухан (НАУ), Яраслаў Бекіш (ЕўраБеларусь), Маргарыта Ворыхава (Беларуская нацыянальная маладзёжная RADA), Дзмітрый Крук (BEROC), Роза Турарбекава, Андрэй Вардамацкі, Павел Патапаў (ZUBR), Сяргей Кедышка і многія іншыя. Шляхам галасавання спікерам і віцэ-спікеркай былі абраныя Андрэй Ягораў і Алена Жываглод адпаведна.

Ніжэй прадстаўлены асноўныя вынікі дэлегатаў і дэлегатак другога склікання за год кадэнцыі.

## Слуханні Каардынацыйнай рады з прадстаўнікамі Аб'яднанага пераходнага кабінета, 2-3 жніўня 2023 года

Слуханні – гэта грамадскі кантроль і адкрытасць структур дэмакратычных сіл. У жніўні прадстаўнікі АПК выступілі з дакладамі перад камісіямі Каардынацыйнай рады, зрабілі справаздачу аб сваёй працы і адказалі на ўсе пытанні з залы. Мерапрыемства праходзіла ў Варшаве ў Палацы навукі і культуры, за трансляцыяй слуханняў можна было назіраць анлайн (спасылкі ніжэй).

Напярэдадні слуханняў у сацыяльных сетках КР была апублікавана форма, якую маглі запоўніць усе жадаючыя, каб задаць пытанні АПК ці агучыць праблемы. Адказы ў

форме значна дапамаглі ўдзельнікам камісій падрыхтавацца да слуханняў і ўзмацніць галасы тых, хто надае ўвагі працоўным працэсам дэмсілаў Беларусі.

Асноўная мэта гэтага мерапрыемства – ацаніць дзейнасць і палітыку кіраўніцтва дэмакратычнай Беларусі, зрабіць яе празрыстай і адкрытай для ўсіх беларусаў і беларусак. За кожным прадстаўніком АПК была замацавана свая працоўная група на чале з адным з дэлегатаў КР. Так, Вольга Кавалькова прымала справаздачу ў Паўла Латушкі – намесніка кіраўніцы АПК, Павел Патапаў узначаліў групу па слуханнях Валера Сахашчыка – прадстаўніка АПК па абароне і нацбяспецы, Паліна Бродзік заслухала Валерыя Кавалеўскага – прадстаўніка АПК па міжнародных справах, Аляксандр Паршанкоў – Аліну Коўшык, прадстаўніцу АПК па нацыянальнаму адраджэнню, дзейнасць Вольгі Гарбуновай, прадстаўніцы АПК па сацыяльнай палітыцы, заслухала Алена Жываглод, Аляксандра Азарава, прадстаўніка АПК па аднаўленню законнасці і правапарадку, інспектаваў Арцём Лядоўскі. Па выніках слуханняў мандат быў працягнуты ўсім прадстаўнікам АПК, акрамя Аляксандра Азарава. Акрамя гэтага кожны ўдзельнік слуханняў атрымаў каштоўныя рэкамендацыі ад КР для больш паспяховай і эфектыўнай працы.

Слуханні прыцягнулі вялікую ўвагу медыя і сталі ўнікальнай з'явай у дэмакратычным руху, на розных пляцоўках за трансляцыяй сачыла больш за 80 тысяч чалавек, а ў медыя з'явілася больш за 150 публікацый на гэтую тэму.

https://www.youtube.com/watch?v=dw7H4nAwwW4
https://www.youtube.com/watch?v=M9TZd3RYwTY
https://www.youtube.com/watch?v=0Oc67Wv2OvE
https://www.youtube.com/watch?v=ERDXuRtaHDQ
https://youtu.be/B1yTwRFeF_4?si=qpbrWuOm-INCn2LH

Справаздача Каардынацыйнай рады Беларусі па выніках слуханняў прадстаўнікоў Аб’яднанага пераходнага кабінета,
https://rada.vision/report_of_the_coordination_council_for_the_united_transition_cabinet_hearing_2023

**Слуханні па пытаннях вызвалення палітвязняў, 2-3 снежня 2023**

У снежні Каардынацыйная рада склікала вялікія двухдзённыя слуханні па пытаннях вызвалення, дапамогі і рэабілітацыі палітычных вязняў дыктатарскага рэжыму ў Беларусі. Мэтай слуханняў стала звяртанне ўвагі на важнасць адзінай стратэгіі вызвалення палітвязняў. Арганізацыяй афлайн-мерапрыемства ў Варшаве займалася працоўная група па палітвязнях пад кіраўніцтвам Таццяны Хоміч і Святланы Мацкевіч.

Слуханні былі высока адзначаны прадстаўнікамі дэмсіл (Так, напрыклад, Вольга Гарбунова і Франак Вячорка назвалі мерапрыемства адным з самых галоўных з

арганізаваных дэмсіламі за 2023 год). Падзея знакавая ў першую чаргу тым, што ўпершыню на адной пляцоўцы прынялі ўдзел усе палітычныя актары і грамадскія структуры, каб абмеркаваць самую галоўную тэму ў нашым парадку дня – тэму палітвязняў, і распрацаваць стратэгіі па іх вызваленні.

Свае пазіцыі агучылі Таццяна Хоміч і Святлана Мацкевіч, Павел Латушка, Валерый Кавалеўскі, Франак Вячорка, Юрый Рававы, Іван Краўцоў, Павел Усаў, Дзмітрый Шчыгельскі, Павел Мацукевіч, Павел Слюнькін, Анатоль Лябедзька, Роза Турарбекава, Вольга Гарбунова, грамадскае яднанне «Нацыянальна-дэмакратычная платформа», а таксама сваякі, былыя палітвязні і грамадскія арганізацыі, якія аказваюць дапамогу палітвязням, Асацыяцыя палітвязняў Беларусі АПБ, Беларуская асацыяцыя палітвязняў «ДА ВОЛІ».

Па выніках слуханняў у сацсетках КР быў апублікаваны чарнавік рэзалюцыі па вызваленні палітвязняў, і да 6 снежня кожны ахвочы мог унесці ў яго свае заўвагі і каментары, пасля чаго дэлегаты КР унеслі ў дакумент праўкі і вынеслі фінальную версію рэзалюцыі на ўнутранае галасаванне. Канчатковая версія рэзалюцыі была апублікаваная 12 снежня. З яе зместам можна азнаёміцца тут.
Як і ў выпадку са слуханнямі АПК, дыскусіі былі публічнымі: за трансляцыяй можна было назіраць анлайн (спасылкі ніжэй). Гэтыя слуханні прыцягнулі не меншую ўвагу СМІ і вярнулі ў парадак дня гарачыя дыскусіі на тэму вызвалення палітвязняў.
https://www.youtube.com/watch?v=U1mSe2Wtllo
https://www.youtube.com/watch?v=pIxr1FtQ3lA

**Стратэгічны дыялог з ЗША, 6-8 снежня 2023**

Стратэгічны дыялог беларускіх дэмакратычных сіл і ЗША – гэта рэгулярны фармат працоўных зносін паміж урадам ЗША, дэмакратычнымі сіламі Беларусі і яе грамадзянскай супольнасцю. Гэта ўнікальны прыклад, калі ЗША ўсталёўваць стратдыялог з дэмакратычным рухам, што значна ўплывае на дэлігітызацыю дыктатарскай улады ў Беларусі. Дыялог прадугледжвае працу тэматычных груп у сферах палітыкі, правоў чалавека і палітычных зняволеных, механізмаў адказнасці і ўніверсальнай юрысдыкцыі, незалежных СМІ і падтрымкі прапаганды, прыватнага бізнесу і прадпрымальніцтва, умацавання беларускай ідэнтычнасці.

Па выніках галасавання 8 дэлегатаў ад КР адправіліся ў ЗША для ўдзелу ў стратдыялогу, а менавіта: Дзмітрый Крук, Юрый Рававой, віцэ-спікерка Алена Жываглод, Таццяна Хоміч, кіраўнік Міжнароднай камісіі Таццяна Марыніч, кіраўнік Камісіі па адукацыі Павел Церашковіч, Надзея Нортан і Яраслаў Бекіш. Удзельнічаць у падрыхтоўцы даклада, з якім дэлегацыя дэмсіл пазней выступіла перад урадам ЗША, запрашалі не толькі прадстаўнікоў палітычных структур, але і ўсіх прадстаўнікоў профільных арганізацый, якія валодаюць экспертызай.

Вынікамі паездкі і галоўнымі высновамі адной з ключавых палітычных падзей года сталі:

- прыняцце законапраекта ў падтрымку дэмакратычнай Беларусі ў абноўленай версіі (Belarus Democracy Act),
- прызначэнне спецпасланніка для працы з дэмсіламі Беларусі,
- стварэнне сумесных працоўных груп па пытаннях вызвалення палітвязняў,
- прыцягнення рэжыму Лукашэнкі да адказнасці,
- план па падтрымцы прыватнага сектара, культурных праектаў, дыяспары і моладзі.

**Кантактная група Беларусь – ЕЗ**

Работа кантактнай групы Беларусь – ЕЗ накіравана на вырашэнне задач па ўсіх спектрах еўрапейска-беларускіх адносін. Гэта платформа для бесперапыннага дыялогу Еўразвяз – Беларусь.

**Рэзалюцыя аб імкненні суверэннай дэмакратычнай Беларусі да сяброўства ў ЕЗ**

Улічваючы пачатак стратэгічнага супрацоўніцтва паміж ЕЗ і дэмакратычнай Беларуссю, стварэнне кансультатыўнай групы ЕЗ-Беларусь, адкрыццё ў Брусэлі офіса дэмакратычнай Беларусі, устойлівую работу кантактнай групы з Саветам Еўропы, а таксама Дэкларацыю Канферэнцыі Новая Беларусь 2023, і вынікі слуханняў па еўрапейскай інтэграцыі ў Каардынацыйны радзе, была прынятая рэзалюцыя.
Рэзалюцыя заяўляе пра Еўрапейскі вектар будучыні дэмакратычнай Беларусі. Рэзалюцыя змяшчае ў сабе падставы для стварэння дакумента, каштоўнасці і напрамкі супрацоўніцтва, стратэгія ўзаемадзеяння з ЕЗ, грамадская думка і падтрымка беларусаў, эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва.

**Кансультацыі па выяўленню патрэб Беларусі ў знешняй дапамозе**

8 студзеня 2024 года спікер КР Андрэй Ягораў аб'явіў аб старце кампаніі па выяўленню патрэб Беларусі ў знешняй дапамозе. З 2022 года Еўракамісія праводзіць штогадовыя кансультацыі для таго, каб міжнародная дапамога адпавядала патрэбам краіны-партнёра, і гэты працэс мадэруе КР і АПК ужо другі год запар.

Пасля 2020 года пераважная большасць міжнародных донараў спыніла супрацоўніцтва з беларускай дзяржавай і перанакіравала сваю падтрымку на супрацоўніцтва з недзяржаўнымі партнёрамі.

Кансультацыі ўключаюць меркаванні арганізацый грамадзянскай супольнасці, дэмакратычных палітычных дзеячаў, незалежных экспертаў, праваабарончых арганізацый, незалежных СМІ, прадстаўнікоў іншых арганізацый.

***Асноўныя напрамкі кансультацый:*** правы чалавека, грамадзянская супольнасць, адукацыя, культура, незалежныя СМІ, бізнес; таксама ў сферы кансультацый уваходзяць міжсектаральныя тэмы гендэра, моладзі, навакольнага асяроддзя і іншыя.

Па выніках кансультацый у кожнай з галін распрацоўваюцца дарожныя карты, у якіх апісваецца стан развіцця галіны, існуючыя праблемы і патрэбы, напрамкі дзейнасці, а таксама агульны аб'ём патрэб у знешняй дапамозе, на аснове чаго фарміруецца стратэгія для Беларусі. Вынікі працы былі прадстаўленыя вясной 2024 года ў Брусэлі на сустрэчы з прадстаўнікамі краін ЕЗ і Еўракамісіі.

**Падрыхтоўка выбараў у Каардынацыйную раду трэцяга склікання**

Згодна са Статутам КР, паўнамоцтвы дэлегатаў і дэлегатак скончыліся 8 лютага 2024 года. Аднак падчас галасаванняў большасцю галасоў было вырашана падоўжыць мандат дзейнага складу Каардынацыйнай рады, каб завяршыць афармленне працэдуры выбараў і іх падрыхтоўкі.

Падрыхтоўка да выбараў пачалася з дэбатаў і круглага стала з запрошанымі экспертамі, падчас якога ўдзельнікі абмяркоўвалі, якімі ж павінны быць выбары ў КР і якую выбарчую сістэму абраць. Першапачаткова было прапанавана 8 канцэпцый выбараў, але спыніцца трэба было толькі на адной: гарачыя дыскусіі не рабілі гэтую справу лёгкай, таму дэдлайны ў гэтай дыстанцыі ўвесь час перамяшчаліся.

У выніку Каардынацыйная рада ў межах падрыхтоўкі да выбараў наступнага складу прыняла за аснову праект выбарчай сістэмы. У ёй былі ўлічаны пажаданні і засцярогі розных прадстаўнікоў дэмакратычнага руху. Гэта была канструктыўная праца, накіраваная на дасягненне кампрамісу дзеля агульнай мэты — сапраўдных дэмакратычных выбараў.

З гэтай мэтай Каардынацыйная рада апублікавала Дэкларацыю аб выбарах і стварыла Арганізацыйны камітэт па выбарах у Каардынацыйную раду трэцяга склікання, куды запрасіла ўсіх прадстаўнікоў дэмакратычных сіл, якія заяўляюць намер удзельнічаць у гэтых выбарах альбо далучыцца да працы Арганізацыйнага камітэта. Прыняць удзел у арганізацыі пажадалі каля 30 экспертаў, прадстаўнікоў палітычных і грамадзянскіх структур і медыя. Сярод іх: рух «Супраціў», БНФ, «Краіна для жыцця», БСДП «Грамада», Асацыяцыя палітвязняў Беларусі, Belarus Democratic Forum ды іншыя. Але дадаткова была створана яшчэ адна працоўная група па выбарам з удзельнікамі ОСЦ і АПК.

29 лютага 2024 года нацыянальная лідарка Святлана Ціханоўская падтрымала выбарчую сістэму ў КР. Фінальны варыянт праекту выбараў выглядае так:

- выбары па прапарцыйнай сістэме з закрытымі спісамі;

- абавязковая квота ў выбарчых спісах на ўдзел жанчын не менш за 40%, з магчымасцю зніжэння гэтай квоты да 20% для тых выбарчых суб'ектаў, якія аб'ектыўна не могуць выканаць квоту ў 40% (арганізацыі ў сферы бяспекі, ветэранскія і іншыя падобныя арганізацыі);
- 1 голас у выбаршчыка;
- пасля выбараў трэці склад Каардынацыйнай рады сфарміруе кансультатыўную Грамадскую палату.

Выбары пройдуць 25-27 траўня 2024 года.

**Праца камісій і груп**

У КР застаюцца актыўныя камісіі і працоўныя групы, працу якіх было б немагчыма замарозіць да моманту абрання новых кандыдатаў. Так, Міжнародная камісія, Камісія па справах студэнцтва, Камісія па адукацыі, працоўная група па вызваленні палітвязняў, Фемгрупа і інш. працягваюць сваю дзейнасць.

**Іншыя міжнародныя падзеі, рэзалюцыі і пагадненні**

**Беларуска-ўкраінскі форум імя Астрожскіх, 6 лістапада 2023**

Форум Астрожскіх – гэта беларуска-ўкраінская экспертная пляцоўка. На сустрэчу ў Львоў прыехалі прадстаўнікі беларускіх дэмсілаў, экспертнай супольнасці Украіны і прадстаўнікі ўкраінскага ўраду. З боку КР у мерапрыемстве прынялі ўдзел Яўген Караулаў, Валерый Мацкевіч, Паліна Бродзік, Юрась Губарэвіч.

Асноўныя вынікі сустрэчы – пагадненне аб слуханнях па Беларусі, а таксама рашэнне аб назначэнні спецыяльнага прадстаўніка Беларусі Ігара Кізіма (былога пасла Украіны ў Беларусі) у Вярхоўнай Радзе Украіны.

**Канферэнцыя Палка Кастуся Каліноўскага «Шлях да волі» ў Кіеве, 29 лістапада 2023**

У мерапрыемстве прынялі ўдзел асноўныя палітычныя актары дэмакратычнай Беларусі і ўкраінскія палітыкі. Каардынацыйная рада была прадстаўлена спікерам, віцэ-спікеркай і яшчэ 8 дэлегатамі.

Удзельнікі канферэнцыі абмеркавалі пытанні вызвалення Беларусі і адносін у беларускім палітычным асяроддзі, а таксама адносіны Беларусі і Украіны. Для беларускай дэлегацыі было важна наладзіць дыялог не толькі з ПКК, але і з украінскімі калегамі, каб яны ўспрымалі дэмсілы як самастойны суб'ект беларускай палітыкі і надзейны партнёр Украіны ў барацьбе з расійскай каланіяльнай палітыкай. На

мерапрыемстве былі прадстаўлены дакументы экспертнай супольнасці Беларусі па пытаннях адносін з Украінай. Пасля заканчэння канферэнцыі спікер КС падпісаў Мемарандум і Зварот да свабодных народаў свету.

**Сустрэча са спецпаслом Украіны ў Беларусі і іншымі дыпламатамі**

Спікер КР Андрэй Ягораў, кіраўнік Міжнароднай камісіі Паліна Бродзік і яе намесніца Роза Турарбекава сустрэліся з паслом Украіны па асобых даручэннях у Беларусі Ігарам Кізімам.

**Збор на FPV-дроны для палкавага БПЛА імя Мікіты Крыўцова**

Былы віцэ-спікер КР Ян Рудзік, які зараз знаходзіцца на вайне ва Украіне ў складзе Палка Кастуся Каліноўскага, аб'явіў аб зборы ў 13 тыс. у.а. на FPV-дроны. Дэмсілы ў асобе КР, ОСЦ, НАУ і інш. падтрымалі збор і заданацілі на патрэбы палка, прадэманстраваўшы палітычную кансалідацыю ў пытанні падтрымкі беларускіх добраахвотнікаў.

Дзейнасць Каардынацыйнай рады другога склікання дала шмат перспектыў грамадзянскай і палітычнай супольнасцям беларусаў. Дэлегаты атрымалі каштоўны досвед у засваенні дэмакратычных працэдур. Праз гэтыя працэсы даюць пачатак парламенцкай культуры дэмакратычнай Беларусі. КР на сваім прыкладзе прадэманстравала, што беларуская палітыка публічная, прааткыўная і цікавая. Гэта выдатная пляцоўка для актывістаў і патэнцыйных лідараў, уваход у публічную беларускую палітыку. КР – гэта разнастайнасць палітычных дэмакратычных сіл: у яго ўваходзяць прадстаўнікі розных поглядаў і экспертыз. Гэта ўнікальнае для дэмакратычнага руху Беларусі шырокае прадстаўніцтва палітычных партый, грамадзянскіх ініцыятываў, грамадскіх дзеячаў, аб'яднаных імкненнем стварыць і зрабіць працоўным палітычны орган грамадзянскага самакіравання.

Дадаткі

# Датак 1 – Аперацыйны бюджэт і фінансаванне дзейнасці Каардынацыйнай рады

У Каардынацыйнай рады няма асабістай юрыдычнай асобы, таму фінансаванне якіх-небудзь выдаткаў звязаных з дзейнасцю Каардынацыйнай рады выконвалася наўпрост фізічным асобам ці падрадчыкам якія выконвалі пэўныя абавязкі. За перыяд з лютага 2023 па чэрвень 2024 года

агульныя выдаткі на аперацыйную дейнасць КР склалі 65612 еўра.

Дадзеныя выдаткі былі прафінансаваны міжнароднымі арганізацыямі па падтрымцы грамадзянская супольнасці.

| Рахунак/Перыяд | 2023 (11 месяцаў) | 2024 (6 месяцаў) | Усяго |
|---|---|---|---|
| Інфармацыйныя сэрвісы і падпіскі | 2970 € | 1275 € | 3825 € |
| Камунікацыйная каманда і кантэнт каманда | 26070 € | 16722 € | 42792 € |
| Служба пратаколу  і міжнародныя сувязі | 8100 € | 10475 € | 18575 € |
| Усяго | 37140 € | 28472 € | 65612 € |

Такім чынам агульныя выдаткі на аперацыйную дейнасць каардынацыйнай рады за 17 месяцаў склалі 65612 €, сярэдні месячны выдатак склаў 3859 €.

Сярэдняя колькасць ставак на паўнавартастную занятасць за 2023 склала 2.7, за 2024 — 3.5. Такім чынам сярэдняя кампенсацыя за стаўку паўнавартасная занятасці за 2023 год склала 1150 эўра брутта. За 2024 год – 1295 эўра брутта.

Кіраўніцтва сакратарыята працавала на валантэрскіх умовах і не атрымлівала кампенсацыі за сваю дзейнасць у КР.

Усе выдаткі пазначаны брутта – і падаткі, такія як ПДВ і ПДФА ўключаны ў пазначаныя вышэй кошты.

# Датак 2 – Справаздача фракцый

**Грамадзянская салідарнасць**

- Кампанія па падрыхтоўцы слуханняў АПК.
- Кампанія па прыцягненню Кіберпартызанаў да ўдзелу ў стратэгічным дыялозе з ЗША.
- Распрацоўка і абмеркаванне этычнага кодэксах і камісіі па этыцы.
- Прэзентацыя праекта Ўстаноўчага схода.
- Кампанія па падрыхтоўцы слуханняў па пытаннях палітзняволеных.
- Распрацоўка праекта Статута Каардынацыйнай рады другога склікання.
- Паднялі пытанне верыфікацыі беларускага бізнеса па-за межамі Беларусі.
- Прынялі ўдзел у складанні заявы Каардынацыйнай рады ў сувязі з дамоўленасцю аб размяшчэнні ў Беларусі ядзернай зброі. https://t.me/c/1559047395/288

- Распрацоўка заявы аб удзеле беларускіх уладаў у COP28: канферэнцыя і саміт ААН па змяненні клімату ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. https://rada.vision/en/regarding-belarus-powers-participation-in-the-cop28-un-climate-change-conference-and-summit-in-united-arab-emirates
- Заява Нарады фракцый з нагоды грамадскіх слуханняў і выдачы ліцэнзіі на эксплуатацыю другога энергаблока БелАЭС. https://rada.vision/by/zayava-narady-frakcyj-z-nagody-gramadskih-sluhannya-i-vydachy-licenzii-na-ekspluatacyju-drugoga-energabloka-belaes
- Распрацоўка і абмеркаванне Мемарандума разам з пляцоўкай «Новая Беларусь».
- Абмеркаванне праблем беларускай дыяспары ў 2023 годзе і магчымая роля працоўнай групы КР у іх вырашэнні. https://telegra.ph/Problemy-belarusskoj-diaspory-v-2023-godu-i-vozmozhnaya-rol-rabochej-gruppy-KS-v-ih-reshenii-04-20
- Даклад Юрыя Раваўога для агульнага складу Каардынацыйнай рады па тэме «Практыка ўхілення ад санкцый».

**Наша Справа**

- Падрыхтоўка і правядзенне кампаніі па змене заканадаўства ў Польшчы.
- Каардынацыя і ўдзел у сустрэчах з беларусамі і беларускімі арганізацыямі ў рэгіёнах.
- Удзел у распрацоўцы пратакола бяспекі.
- Удзел у выпрацоўцы пазіцыі КР па мясцовых і парламенцкіх выбарах-2024.
- Удзел у слуханнях АПК.
- Дзве прапановы па фармаванню наступнага складу.
- Удзел у канферэнцыі з Палком Каліноўскага.
- Удзел у стратэгічным дыялозе з ЗША.
- Удзел у канферэнцыях.
- Падтрымка рэабілітацыйнага цэнтра ў Кіеве.

**Шчаслівая нацыя**

- Падрыхтоўка Палажэння па кааптацыі.
- Падрыхтоўка і правядзенне Стратэгічнай сесіі КР.
- Удзел у падрыхтоўцы і правядзенні слуханняў з АПК.
- Удзел і кіраўніцтва міжнароднай камісіяй.
- Удзел у працы Кантактнай групы Савета Еўропы.
- Дапамога з візавымі пытаннямі.
- Падрыхтоўка і прынящце пазіцыі КР па сітуацыі з Belpol.
- Удзел у Стратэгічным дыялогу з ЗША.
- Распрацоўка і прэзентацыя стратэгіі падтрымкі беларускага бізнесу.
- Падрыхтоўка заявы па Ізраілю.

**Фемфракцыя**

Фемфракцыя выбудавалася ў лістападзе 2023 года. https://t.me/rada_vision/3533

Распрацоўка канцэпцыі гендэрных квот для КР. https://t.me/rada_vision/3724
Гэта нагода стала асновай для публічных дыскусій у грамадстве.
https://pozirk.online/ru/longreads/66887/
https://euroradio.fm/ru/zhenschiny-vperyod-nuzhny-li-gendernye-kvoty-v-ks-i-zachem-efir
Падрыхтоўка Рэзалюцыі для правядзення стратэгічнага дыялогу з ЗША, раздзел па гендэрнай роўнасці і правам жанчын.
Удзел у сустрэчы КР са спец прадстаўнікамі беларускіх дэмсіл з Эстоніі, Швецыі, Польшчы і Літвы.
Удзел у Кантактнай групе Савета Еўропы.
Удзел у пасяджаннях Упаўнаважанай працоўнай групы.
Удзел у Грамадскай палаце КР.
Удзел у падрыхтоўцы стратэгіі выбараў у КР.
Падрыхтоўка стратэгічнага плана Фемфракцыі на 2024 год. Фем-лінза для КР.
Удзелы ў эфірах беларускіх блогераў.

**Моладзевы Наступ**

- Удзел у працы камісіі па справах студэнтаў.
- Удзел у працы ў складзе юрыдычнай камісіі.
- Удзел у працы ў складзе міжнароднай камісіі.
- Удзел у падрыхтоўцы слуханняў па пытаннях палітзняволеных.
- Удзел у падрыхтоўцы слуханняў АПК.
- Заява ў падтрымку ЛГБТК+ https://docs.google.com/document/d/1LAWE8jbADmDEtr8bKyeZyQkpEej2hPEbwZ_n2-U2KDU/edit
- Удзел у распрацоўцы канцэпцыі выбараў. https://drive.google.com/drive/u/1/folders/1uNLfIDT9EkrX5hjjOa45IspOkGFe-DOP?pli=1
- Удзел у стратэгічным дыялозе з ЗША. https://t.me/moladzievynastup/165
- Удзел у сустрэчы кантактнай групы Савета Еўропы. https://t.me/moladzievynastup/163
- Канферэнцыя з удзелам Палка Каліноўскага. https://t.me/moladzievynastup/162
- Беларуска-ўкраінскі экспертны форум імя Астрожскіх. https://t.me/moladzievynastup/146
- Сустрэча з амерыканскімі студэнтамі ў Лібэрцы. https://t.me/moladzievynastup/125
- Канферэнцыя польска-беларускіх адносінаў у Сейме. https://t.me/moladzievynastup/116

- Працоўная група па стыпендыі SALT.
- Удзел у сустрэчах па стратэгічнаму планаванню КР.
- Кампанія па падтрымцы палітзняволеных (Dissidentby). https://dissidentby.com/guardians
- Сходка МБ+ЗБС у Варшаве. Дэбаты на тэму патрэбнасці КР https://t.me/moladzievynastup/285
- Афлайн семінар па публічнай палітыцы https://t.me/moladzievynastup/270

# Датак 3 – Справаздачы Камісій

**Камісія па адукацыі**

- Мемарандум «Аб'ядноўваючы намаганні для падрыхтоўкі рэформы адукацыі» (11.11.2023). Мемарандум змяшчае грунтоўны аналіз сітуацыі ў галіне адукацыі ў Беларусі, фармулюе мэту і задачы адукацыйнай палітыкі дэмакратычных сілаў. Тэкст Мемарандума быў абмеркаваны і зацверджаны Камісіяй у кастрычніку – лістападзе 2023 г.
- Заява КРБ адносна скандала з правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання ў РБ. https://rada.vision/by/doc/zayava-kamisii-pa-adukacyi-kaardynacyjnaj-rady-belarusi
- Сумесная заява (з Камісіяй па справах студэнцтва) па выпадку магчымага харасменту ў ЕГУ https://rada.vision/by/sumesnaya-zayava-kamisii-pa-spravah-studenctva-i-kamisii-pa-adukacyi-navucy-i-gramadskaj-dumcy-kaardynacyjnaj-rady
- Сумесны зварот старшыні Камісіі і Прадстаўніцы АПК па нацыянальным адраджэнні А. Коўшык да рэктара ЕГУ адносна перспектыў Універсітэта і беларускай грамадзянскай супольнасці.
- Серыя мерапрыемстваў па падрыхтоўцы ацэнкі патрэбаў і дарожнай карты знешняй дапамогі ў галіне адукацыі і навукі грамадзянскай супольнасці Беларусі для Еўрапейскай камісіі ў студзені 2024 г
- Праведзена слуханне на ўзроўні Камісіі па праблемах Праграмы Кастуся Каліноўскага з удзелам студэнтаў і слухачоў моўных курсаў (29.06.2023). Была зробленая выснова, што фармат рэалізацыі Праграмы не быў прыстасаваны да зменаў пасля 2020 г.
- Распрацоўка і абгрунтаванне стварэння Камісіі з апісаннем яе мэты, задач і паўнамоцтваў. Ухваленае на пасяджэнні Нарады фракцый 20.04.2023.
- Распрацаваны, абмеркаваны і зацверджаны Рэгламент камісіі (13.07.2023)
- Праведзеныя сумесныя паседжэнні з прадстаўнікамі АПК і ОСЦ. Былі абмеркаваныя пытанні арганізацыі абмена інфармацыяй і каардынацыі супольных дзеянняў, магчымых захадаў па стварэнню Цэнтра беларусістыкі ў Германіі, прадстаўленню стыпендый для навучання беларусаў у нямецкіх

універсітэтах, праблемаў у Праграме Кастуся Каліноўскага, вынікаў конкурса на пасаду прарэктара ЕГУ і інш.

· Сябры камісіі А.Лаўрухін, С.Мацкевіч, М.Сакалова і П. Церашковіч прынялі ўдзел у серыі семінараў “Рэформа беларускай сістэмы адукацыі. Канцэпцыі і падыходы», які арганізуецца ў рамках праекту «Васьміног: адукацыя для беларускіх дзяцей сёння і заўтра».

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел і выступіў на сустрэчы з у Сейме і Сенаты Рэспублікі Польшча 15.06.2023. З польскага боку ў сустрэчы прымалі ўдзел спікер Сейма Эльжбета Вітэк, віцэ-спікер Сената Міхал Каміньскі, старшыня парламенцкай групы »За дэмакратычную Беларусь» Роберт Тышкевіч, сенатар Александр Пацей. Былі абмеркаваныя пытанні развіцця адукацыі для беларусаў-эмігрантаў у Польшчы.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел і выступіў на сустрэчы з кіраўніцтвам ЕГУ і прадстаўнікамі Генеральнай асамблеі ўласнікаў 18.09.2023 для абмеркавання стратэгіі супрацоўніцтва ЕГУ з беларускай грамадзянскай супольнасцю і праблем выкарыстання беларускай мовы ў выкладанні. Была зроблена прапанова ўключыць у кіроўныя струкутры ЕГУ прадстаўнікоў арганізацый беларускай грамадзянскай супольнасці.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел і выступіў на сустрэчы з кіраўніцтвам ЕГУ, сябрамі Кіроўнай рады і Генеральнай асамблеі ўласнікаў 13.12.2023 для абмеркавання канкрэтных крокаў па ўдзелу беларускай грамадзянскай супольнасці ў структурах кіравання ўніверсітэта. Была зроблена прапанова перагледзець фармулёўку місіі ўніверсітэта і змяніць сітуацыю з выкарыстаннем беларускай мовы ў выкладанні.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел у публічных слуханнях па праблеме «літвінізма» у Камісіі па бяспецы Сейма Літоўскай Рэспублікі 02.10.2023.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел у перамовах з кіраўніцтвам Гімназіі імя Ф. Скарыны ў Вільні з нагоды перспектыў адкрыцця новай беларускамоўнай школы 05.09.2023.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел у сустрэчы з віцэ-мэрам Вільні Сімонай Біеліуне ў сувязі са зваротам аб адкрыцці новай беларускамоўнай школы ў Вільні 20.10.2023.

· Падрыхтоўка прапаноў для стратэгічнага дыялога паміж ЗША і дэмакратычнымі сіламі Беларусі па праблемах ідэнтычнасці і культуры.

· Старшыня камісіі П.Церашковіч прыняў удзел і выступіў на Стратэгічным дыялогу паміж ЗША і дэмакратычнымі сіламі Беларусі ў Вашынгтоне 5-6.12.2023. Выступ быў прысвечаны становішчу беларускай мовы і ідэнтычнасці, канкрэтным крокам па іх умацаванні і магчымай ролі ЗША ў гэтым.

**Камісія па справах студэнцтва**

- Удзел у сустрэчы-дыскусіі са студэнтамі са Злучаных Штатаў Амерыкі ў Тэхнічным універсітэце горада Ліберац.

- Арганізацыя і правядзенне лекцыі-сустрэчы «Студэнцкі 2020: як гэта было» сумесна з офісам дэмакратычных сілаў Беларусі ў Чэхіі.
- Удзел у адкрытай сустрэчы з прадстаўнікамі міністэрства адукацыі Польшчы і кіраўніцтвам праграмы імя К. Каліноўскага.
- Удзел у канферэнцыі "Representation of initiatives and organizations working with educational research and issues of reforming Belarusian education and science".
- Заява з нагоды зменаў у Законе «Аб воінскім абавязку і воінскай службе».
- Сумесная заява Камісіі па справах студэнцтва і Камісіі па адукацыі, навуцы і грамадскай думцы Каардынацыйнай рады па выпадках магчымага харасменту ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце.
- Узнагароджанне падзякамі прадстаўніц нямецкага таварыства па вывучэнні Усходняй Еўропы за ўдзел у арганізацыі «Форума гістарычных даследаванняў Беларусі», у межах дзейнасці якога маладыя беларускія даследчыкі і даследчыцы, дактарантκі і дактаранты мелі магчымасць атрымаць стыпендыю і падтрымку, а таксама за падрыхтоўку мерапрыемстваў, якія ўплываюць на фарміраванне аб'ектыўнага ўспрыняцця беларускай гісторыі і культуры ў свеце.
- Камунікацыя і супраца з праграмай Кастуся Каліноўскага.
- Падтрымка зваротнай сувязі з беларусамі.
- Выдача пацвярджальных лістоў і рэкамендацый ад імя старшыні камісіі (16 лістоў)

**Міжнародная камісія**

**Распрацоўка і абмеркаванне канцэптуальных дакументаў**

- Распрацаваны прапановы па фарміраванні камісіі і яе парадку дня.
- Распрацаваны рэгламент камісіі.
- Унесены прапановы ў Пратакол з АПК у частцы міжнароднай працы.
- Вызначана схема кансультацый з АПК і ОСТ.
- Распрацаваны бюджэт камісіі і ўнесены прапановы ў агульны бюджэт КР.
- Прапанаваны і прыняты прыярытэты працы камісіі на 2023 год.
- Распрацаваны прапановы ў стратэгічны дыялог Беларусь-ЗША.
- Унесены прапановы да сустрэч СТ з шэрагам міжнародных партнёраў.
- Падведзены вынікі і прэзентаваны вынікі дзейнасці міжнароднай групы. https://docs.google.com/presentation/d/1Bh2ogEGg6ppPOU_yMEG2OrrQ7wSn329-/edit#slide=id.p1
- Падрыхтаваны рэкамендацыі Прадстаўніку АПК па замежных справах у рамках слуханняў КР. https://docs.google.com/document/d/1AT5o3GfwHIHSX6ILdcIVOydEI5w6ggcIJyX6QHqjBu0/edit
- Распрацавана Канцэпцыя міжнароднай палітыкі дэмакратычных сіл Беларусі 2024-2025.

- Скаардынавана работа і падрыхтаваны тэзісы для работы Стратэгічнага дыялогу Беларусь – ЗША. https://docs.google.com/document/d/1Z-GZF4O2yk46XNIi2Xwny575KRLP3Z9i8tWy-fXleBU/edit
- Распрацавана, перакладзена на англійскую мову кароткая версія Канцэпцыі міжнароднай палітыкі дэмакратычных сіл Беларусі 2024-2025. https://drive.google.com/file/d/1PC98oN-mmZQgYEOj9m-UN8_4nJzDQLk8/view?usp=sharing

# Датак 4 – Сустрэчы

**Працоўныя сустрэчы:**

- Праведзены кансультацыі з ключавымі партнёрамі АПК і ОСЦ, а таксама шэрагам экспертаў.
- Праведзены сустрэчы з міжнароднымі партнёрамі: ЕС і ЗША, дэпутатамі і прадстаўнікамі асобных краін (Літва, Украіна, Галандыя, Францыя)
- Праведзена сесія з АПК і ОСЦ па абмеркаванні Канцэпцыі КР па знешняй палітыцы.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у слуханнях АПК, па выніках якіх далі рэкамендацыі прадстаўніку АПК па замежных справах.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у сустрэчы КР з амбасадарамі і спецпрадстаўнікамі Швецыі, Эстоніі, Літвы.
- Праведзены шэраг сустрэч з экспертамі і членамі КР па распрацоўцы Канцэпцыі міжнароднай палітыкі дэмакратычных сіл Беларусі 2024-2025.

**Мерапрыемствы**

- Праведзена дыскусія для сяброў КР па геапалітычных перавагах беларусаў.
- Чальцы камісіі прынялі ўдзел у сустрэчы па стратэгіі ЕЗ-Беларусь у Стакгольме.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у сустрэчах кантактнай групы Рады Еўропы, сустрэчах СЦ з Прэзідэнтам ПАРЕ, амбасадарамі 40+ краін пры ПАРЕ.
- Члены камісіі прынялі ўдзел у сустрэчах з пасламі і дэпутатамі асобных дзяржаў, у тым ліку дэпутатаў Вярхоўнай Рады Украіны.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у сустрэчах у Літоўскім Сейме.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у цырымоніі ўзнагароджання Зяленскай прэміяй Карла Вялікага.
- Члены камісіі правялі канферэнцыю “Civil society organizations and political parties in Belarus and countries of Lublin Triangle and military situation in Eastern Europe”.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у канферэнцыі, прысвечанай праблемам парушэння правоў на свабоду сумлення ў Беларусі.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у сайд-івентах па Беларусі ў рамках Саміту НАТА ў Вільні.

- Сябры камісіі прынялі ўдзел у падрыхтоўцы Канферэнцыі Новая Беларусь 2023.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у Круглым стале палітычных лідэраў напярэдадні Канферэнцыі Новая Беларусь 2023
- Члены камісіі прынялі ўдзел у сесіях Кансультатыўнай групы «Беларусь – Еўразвяз».
- Члены камісіі прынялі ўдзел у Канферэнцыі "Belarus does not exist?", Copenhagen, 28.09.2023 з тэмай "Can China replace the EU як "second pillar" of Belarusian foreign policy after 2020?"
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у падрыхтоўцы Канферэнцыі «Шлях да волі» ў Кіеве 29 кастрычніка 2023.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у канферэнцыі Каліноўскага 13 верасня 2023 года ў Страсбургу.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у Канферэнцыі Братоў Астрожскіх на тэму беларуска-ўкраінскіх стасункаў у Львове ў лістападзе 2023 г.
- Члены камісіі прынялі ўдзел у Стратэгічным дыялогу Беларусь – ЗША ў снежні 2023 года.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у сустрэчы Еўрапейскага парламента па пытаннях Беларусі, Страсбург, 13 снежня 2023 года.
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у Канферэнцыі Беларускай сеткі (экспертнай) па палітыцы суседства, Рыга, 10 студзеня 2024 г. з тэмай «Якая стратэгія для Еўрапейскай Беларусі?»
- Сябры камісіі прынялі ўдзел у канферэнцыі Хельсінскі дыялог 11-12 студзеня 2024 года па тэме палітвязняў.

# Датак 5 – Кампаніі

- Правялі слуханні КР па еўрапейскай перспектыве.
- Сябры камісіі арганізоўвалі і ўдзельнічалі ў слуханнях КР па палітвязнях.
- Кампанія па зборы інфармацыі ад беларусаў і беларусак аб праблемных пытаннях перасячэння мяжы і знаходжання ў Польшчы.
- Каардынацыя і збор дадзеных сумесна з АПК і сярод беларускіх грамадзянскіх арганізацый у Польшчы для падрыхтоўкі спісу прапаноў па паляпшэнні сітуацыі з правамі беларусаў у Польшчы.
- Складанне звароту з прапановамі па паляпшэнні сітуацыі з правамі беларусаў для новага ўрада Польшчы.

# Датак 6 – Прынятыя заявы

- Распрацаваны 2 рэзалюцыі па сітуацыі з абмежаваннем мабільнасці беларусаў у Літве.
- Распрацавана рэзалюцыя па сітуацыі з Віктарам Бабарыкам.
- Сябры камісіі таксама ініцыявалі рэзалюцыю КР па ILO.

- Зварот КР да міжнароднай супольнасці наконт мецяжу ў Расіі. https://docs.google.com/document/d/1mV0MtvxcSuAHooyogh4562eZ2hctJ7EvzDRgAgfraiY/edit
- Рэзалюцыя аб імкненні суверэннай дэмакратычнай Беларусі да сяброўства ў ЕС. https://docs.google.com/document/d/1eNOpBmRLmwD_v_7po9-9aXPzkIdUCudfbTQa4u2AzT8/edit#heading=h.sijk1ndmmgmj
- Заява КР у сувязі з беспрэцэндзетнай дыскрымінацыяй рэжымам грамадзян Беларусі за мяжой. https://docs.google.com/document/d/1Vxxz_c-x35lnlYNmf_7J7fuJKASwmfm4PDy1xU0qLzE/edit
- Заява КР у сувязі з сітуацыяй у Ізраілі. https://t.me/rada_vision/3447
- Заява КР у сувязі са стральбой у Карлаўскім універсітэце ў Чэхіі. https://t.me/rada_vision/3654

*З павагай,*

*Андрэй Ягораў,*

*Спікер Каардынацыйнай рады*

